# НОВАПЯЧЭРСКІ ДЗЯЦЕЛАВІЦКІ СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКІ МАНАСТЫР – КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ЦЭНТР ПАЛЕССЯ



Доклад кандидата филологических наук, доцента Брестского технического университета Самуйлика Ярослава Григорьевича, автора монографии «Гаворкі Выганаўскага Палесся», имеющего более 60 научных публикаций.

Дзятлавічы – вёска ў Лунінецкім раёне, цэнтр аднайменнага сельсавета. У пісьмовых крыніцах упершыню згадваецца ў 1514 г. пад назвай на рускай мове «Дятеловичи». Паселішча належала да аднайменнага маёнтка. У 1566 г. Станіслаў Андрэевіч Давойна – стрыечны брат полацкага ваяводы Станіслава Давойны, які трапіў у маскоўскі палон, – ад імя свайго родзіча прадаў сяло Дзяцелавічы шляхціцу Паўлу Падарэўскаму. Гэта быў першы шляхецкі маёнтак на Лунінеччыне, які ўжо не з'яўляўся дадаткам да вялізных магнацкіх вотчын. У 1567 г. паселішча ў складзе Новагародскага павета Новагародскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. У 1599 г. Дзяцелавічы – мястэчка. Хутка Падарэўскія прадалі Дзяцелавічы Якубу Кунцэвічу. Апошні прыходзіўся родзічам Барбары Нарушэвіч, ад якой набыў належачы ёй маёнтак Лунінец.

У 1618 г. Якуб Кунцэвіч разам з сынам Мікалаем прадалі Лунінец і Дзяцелавічы каралеўскаму двараніну Канстанціну Багданавічу Долмату-Цяперскаму. К. Долмат, не маючы дзяцей «и движимый благочестивой ревностью о поддержании православия, преследуемого уже возникшей тогда унией, с согласия и жаления своей жены Анны из дома Юрковских» запісаў на дзяцелавіцкую Праабражэнскую царкву свае маёнткі – вёскі Дзяцелавічы, Лулінец і Мелясніцу разам з жыхарамі. У дароўным запісе была пастаўлена ўмова, каб кіева-пячэрскія манахі заснавалі ў Дзяцелавічах манастыр, падпарадкаваны Канстанцінопальскаму патрыярху і Кіеўскаму мітрапаліту.

Гісторыя ўзнікнення Дзяцелавіцкага манастыра супярэчлівая: існуюць дзве яе версіі. Паводле агульнапрынятай версіі, узвядзенне манастыра пачалося ў 1622 г. «Назву сваю гэты манастыр мае па сяле Дзяцелавічы, пры якім і пры рацэ Малая Цна становішча сваё мае, будучы абкружаны лясамі і балотамі. Начальства там здаўна ігуменскае, але калі дакладна і кім зацверджана, аб тым звестак няма... Царква там стаіць у імя Праабражэння Гасподняга, драўляная, новая, іншыя манастырскія будынкі...» У 1625 г. Новапячэрскі Дзяцелавіцкі Спаса-Праабражэнскі мужчынскі манастыр быў збудаваны. Кіраўніцтва манастыром К. Долмат перадаў архімандрыту Кіева-Пячэрскай лаўры Елісею Плецянецкаму.

Польскі гісторык праваслаўнай царквы Антон Міравовіч прытрымліваецца іншага пункту гледжання на гісторыю заснавання Дзяцелавіцкага манастыра: «Мужчынскі Спаса-Праабражэнскі манастыр у Дзятлавічах быў заснаваны ў XVI ст. у месцы, дзе рака Цна ўпадае ў Прыпяць. Яго заснавальнікам быў князь Канстанцін Астрожскі, які ў сваіх уладаннях загадаў закласці манастыр з бальніцай і годна надзяліў яго ўладаннямі. Пасля Брэсцкай уніі манастыр быў зачынены на некалькі гадоў, далей ізноў адноўлены, дзякуючы намаганням Канстанціна Долмата, які ў 1622 г. запісаў манастыру ўладанні – Дзятлавічы і Лулінец». Гісторык архітэктуры Інеса Слюнькова, на якую спасылаецца прафесар Міравовіч, лічыць годам заснавання манастыра 1570-ты. На карысць гэтай версіі гаворыць і сведчанне аўтарытэтнага даследчыка гісторыі праваслаўнай царквы на Піншчыне Аляксандра Мілавідава, і тое, што ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску ёсць інвентары Дзятлавіцкага манастыра за 1588 і 1620 гады. Апрача таго, у вядомым Сінодзіку манастыра запісана такая вялікая колькасць яго ігуменаў, што напрошваецца вывад, што манастыр узнік намнога раней, чым у 1622 годзе. Ва ўсіх дакументах К. Долмата называюць не кцітарам (заснавальнікам) манастыра, а яго фундатарам (ахвяравальнікам).

У 1648 г. пачалося паўстанне ўкраінскіх казакоў пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. Яно было падтрымана праваслаўным насельніцтвам Палесся: сялянствам, мяшчанствам, духавенствам і часткай шляхты. Да польска-ўкраінскай вайны, якая зацягнулася, далучыліся Маскоўская дзяржава і Швецыя. Баявыя дзеянні на Піншчыне працягваліся да 1660 г. Вядома, манастырскія ўладанні былі цалкам спустошаныя, уключаючы і сам манастыр, які, верагодна, быў спалены. Манахі, разумеючы ўсю небяспеку, што пагражала манастыру, вывезлі ўсё каштоўнае ў Кіева-Пячэрскую лаўру, якая ўяўляла сабой сапраўдную крэпасць, ды і ў самім Кіеве заўсёды знаходзіўся вялікі ваенны гарнізон. У лаўру былі вывезены і дакументы гэтага манастыра, якія згарэлі там у 1667 г. Згарэлі ў лаўры, напэўна, і прывілеі, выдадзеныя польскімі каралямі Жыгімонтам III і Уладзіславам IV Дзяцелавіцкаму манастыру на ўладанні вёскамі Дзятлавічы і Лулінец, і самой лаўры на кіраўніцтва ёю палескім манастыром. Пасля вайны, у 1669 г., новы кароль Рэчы Паспалітай Міхаіл Вішнявецкі пацвердзіў правы лаўры на Дзяцелавічы і Лулінец.

На той час ігуменам Дзяцелавіцкага манастыра фактычна стаў епіскап Беларускі і архімандрыт Слуцкі Феадосій Васілевіч. З пратэстацыі Кіева-Пячэрскага манастыра (10 ліпеня 1699 г.) відаць, што Феадосій, калі Слуцкая Архімандрыя ў ваенныя часы была спустошана, больш за дзесяць гадоў жыў у Дзяцелавічах, называў сябе старшым Дзяцелавіцкага манастыра. Аднак факты сведчаць, што ён не хацеў падпарадкоўвацца Кіеўскай мітраполіі. Каб, напэўна, замацаваць правы Беларускай епархіі на Дзяцелавіцкі манастыр Ф. Васілевіч завяшчаў пахаваць сябе ў гэтым манастыры, што і зрабіў у 1678 г. грэчаскі мітрапаліт Макарый Лігарыдзі. Пры пахаванні надмагільнае слова казаў святы Дзмітрый Растоўскі, які быў тады прапаведнікам ў Слуцкім Троіцкім манастыры.

Пасля смерці Ф. Васілевіча манастыр не перайшоў пад кантроль лаўры: ігуменам стаў слуцкі архімандрыт Серапіён Пальхоўскі, будучы епіскап Беларускі. Аднак лаўра трошкі пазней усё ж вярнула сабе кантроль над Дзяцелавіцкім манастыром. У кнізе «Гісторыя Мінскай епархіі» ёсць апісанне ўладанняў манастыра, зробленае па старых дакументах: «Пры Дзяцелавіцкім Праабражэнскім манастыры ёсць маёнтак наступны: сяло Дзяцелавічы, дзе, па апошняй рэвізіі, душ мужскога полу 304, жаночага 299, а ўсяго 603 душы; сяло Мелясніца, дзе мужскога полу 24, жаночага 16, а ўсяго 40 душ». Далей паведамлялася, што 12 сакавіка 1676 г. польскі кароль

Ян III пацвердзіў, што перададзеныя К. Долматам вёскі па-ранейшаму належаць манастыру. Манастыр меў 808 валок зямлі.

Манастыры ў той час былі своеасаблівымі цэнтрамі аб'яднання праваслаўнага насельніцтва, сюды нярэдка хаваліся ад гневу памешчыкаў прыгонныя сяляне, хоць не заўжды паспяхова.

У пачатку XVIII ст. (з 1705 г.) манастыром кіраваў Мадэст Ільніцкі, які пазней стаў намеснікам Кіева-Пячэрскай лаўры. Яго сябар, мітрапаліт Стэфан Яворскі, якога імператар Пётр I прызначыў месцаахоўнікам патрыяршага прастола, заснаваў на свае грошы Нежынскі Богаяўленскі манастыр, што лічыў справай усяго свайго жыцця. У 1714 г. мітрапаліт прызначыў першым ігуменам манастыра Мадэста Ільніцкага.

У 1723 г. ігуменам Дзяцелавіцкага манастыра быў Мяленцій (яго прозвішча невядома), які «пасылаў двух іераманахаў з паслушнікамі ў Давід-Гарадоцкую пратапопію для агляду благачыння ў сельскім духавенстве і для збору сталовых грошай».

Ігумен Іаанікій (магчыма прозвішча Юркевіч), узначаліўшы манастыр у маі 1747 г., тут жа пачаў адстойваць зямельныя ўладанні манастыра, уступіў у судовыя спрэчкі з суседнімі памешчыкамі, якія квапіліся на іх. Праз год ён скардзіўся ў Свяшчэнны Сінод у Санкт-Пецярбург, што 17 гадоў цягнецца пазямельная справа манастыра з памешчыкам Долматам, які захапіў манастырскія ўгоддзі. Ігумен ездзіў нават у Варшаву, але ў шляхціца-каталіка (ён быў далёкім нашчадкам па адной з галін фаміліі заснавальніка манастыра) там паўсюдь былі сябры.

У выніку мінскі трыбунал адклаў справу на няпэўны тэрмін і забараніў звяртацца ў іншыя судовыя інстанцыі пад пагрозай пазбаўлення манастыра ўсіх уладанняў.

У 1748 г. кажан-гарадоцкі шляхціц Шчыт захапіў у манастыра значную частку палёў, сенажацяў, участкаў рыбнай лоўлі. Суд, стоячы на абароне памешчыкаў-каталікаў, адклаў справу на няпэўны тэрмін. Шчыт тым часам вырашыў адпомсціць манастыру за перадачу справы ў суд. Восенню ігумен Іаанікій па справах манастыра са світай накіроўваўся ў Кіеў. Шчыт, даведаўшыся аб шляху ігумена праз свае ўладанні, пасадзіў на лясной дарозе некалькі прыгонных, якія па яго загадзе напалі на ігуменскі абоз, абрабавалі яго, збілі асоб, суправаджаючых ігумена. За гэтыя злачынныя дзеянні ніхто не панёс ніякай кары.

Наступны ігумен манастыра напісаў у снежні 1753 г.: «Синодик или собрания душ, то есть имён Христиан Православных усопших в надежде воскрешения живота вечного, обеего пола, всякого чина Духовного и Мирского, Милостивых благодетелей и укладчиков в церкве Преображения Господня в монастыре Дятеловичском составлен и написан своеручным трудом иеромонаха Дионисия Вороновского». Пасля прадмовы да чытальніка на 41 старонцы былі запісаны імёны для памінання. Спіс кімсьці рэгулярна папаўняўся да канца XVIII ст. Пачыналіся памінальныя спісы імёнамі патрыярхаў Нікана, Іаакіма, Андрыяна. Далей ішлі цары і царыцы. Не забыты быў і род заснавальніка манастыра К. Долмата. Далей пералічваліся мітрапаліты, архімандрыты, епіскапы і агульнае «памінанне ўсіх сумленных іераманахаў святых манастыроў нашых Кіева-Пячэрскіх і Дзяцелавіцкіх» з пералічэннем усіх вядомых да таго часу ігуменаў і намеснікаў манастыра: Васіль Пялькевіч, Павел Усовіч, Гедэон Агаркоўскі, Мадэст Ільніцкі, Сільвестр Вальковіч, Аліпій Асманецкі, Лявонцій Бункевіч, Іаанікій Юркевіч, Іўсцін Зверакі, Інакенцій Буткевіч, Руф Дунаеўскі, Іўсцін Васілевіч, Манасій Паграбенскі, Сілуян Азерскі, Дарафей Ісаевіч. У запісе за 1755 г. (у іншай крыніцы ўказаны 1775 г., аднак з заўвагай – відаць) прыгадваецца ігумен Мяленцій Бувайла-Лясніцкі (кіраваў манастыром самы працяглы час, амаль 20 гадоў), за 1766 г. – духоўнік дзяцелавіцкі Мяленцій, за 1768 г. – ігумен Феакціст Яворскі. У 1792 г. запісаны Кіпрыян Астроўскі, кафедральны намеснік і першы член Слуцкай духоўнай кансісторыі, у 1800 г. – Іаасаф, у 1823 г. – архімандрыт Маркіян. Памінаюцца таксама многія дваранскія роды з Давыд-Гарадка, Слуцка, Лахвы, Кажан-Гарадка, а таксама дзяцелавіцкія кцітары (царкоўныя старасты) Дашкевіч і Яцыніч. З пачатку XIX ст. да 1850 г. у Сінодзіку былі зроблены некалькі запісаў. Апошні з іх: «Памяні, Госпадзі, душу рабы твая графіні Ганны Аляксееўны Арловай-Часменскай за ахвяраванне ёю 5 тысяч рублёў Пінскаму Богаяўленскаму манастыру» (да яго быў прыпісаны Дзяцелавіцкі манастыр у 1842 г.).

Па ведамасці 1768 г. Дзяцелавіцкі манастыр лічыўся ў Кіеўскай епархіі, а да 1786 г. – у валоданні Кіева-Пячэрскай лаўры (па гэтай прычыне ён называўся яшчэ і Новапячэрскім), таму што ў Рэчы Паспалітай не было праваслаўных епархій.

На той час Дзяцелавіцкі манастыр з'яўляўся значным ачагом культуры ў лясістым, балоцістым і бездарожным кутку Палесся. Сярод яго манахаў былі высокаадукаваныя людзі. Вядома, што два іераманахі гэтага манастыра, Раман (з 1796 г.) і Маркіян (з 1809 г.), былі запрошаны на пасады настаўнікаў у Мінскую духоўную семінарыю. У манастыры меліся даволі вялікая бібліятэка старажытных рукапісных і друкаваных кніг, пераплётная майстэрня, майстэрні па рамонце і абнаўленні царкоўнага посуду, невялікая іканапісная майстэрня, «шпіталь», у якім манахі лячылі сродкамі народнай медыцыны не толькі сваіх сабрацяў, але і жыхароў навакольных вёсак.

Пасля далучэння Лунінеччыны да Расіі (падчас другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 г.) Дзяцелавічы і Лунінец па-ранейшаму заставаліся ў валоданні манастыра. Для папаўнення сваёй казны манастыр здаваў у арэнду асобныя пабудовы і цэлыя вёскі. Аднак жыхары Дзяцелавіч грашовых падаткаў манастыру не плацілі, а толькі пачаргова апрацоўвалі манастырскую зямлю і сенажаці.

У Мінскай епархіі Дзяцелавіцкі манастыр лічыўся адным з першых, таму быць яго ігуменам было пачэсна і прыбыткова. Адзін з дакументаў сведчыць: «Ігумен Кіпрыян Астроўскі прызначаны 11 лістапада 1792 г. у самы багаты манастыр епархіі – Дзяцелавіцкі, былы ігумен якога Мяленцій памёр». У памочнікі мінскаму епіскапу Віктару быў прызначаны ў 1794 г. архімандрыт Варлаам, аб чым паведамлялася: «Свяцейшы Сінод пажадаў вызначыць яго ў багаты і лепшы манастыр епархіі Дзяцелавіцкі, адзіна багаты сярод мноства збяднеўшых».

Грошы, якія паступалі ад арандатараў, выкарыстоўваліся на жалаванне ігумену, служачым і брацііі манастыра, на посуд, адзенне, на ўсякія падаткі па загадах і на пакупку некаторых харчовых прыпасаў. Усе прыбыткі і выдаткі запісваліся ў спецыяльныя кнігі.

У час Айчыннай вайны 1812 г. манастыр не падвергся нашэсцю французаў, але вайна закранула яго. Ёсць звесткі, што ў манастырскім шпіталі знаходзіліся некалькі параненых рускіх воінаў. 7 ліпеня 1812 г. французы ўвайшлі ў Слуцк. Захопнікі рабавалі горад, яго жыхароў, храмы, лаўкі. Была разгромлена і багатая па тым часе бібліятэка Слуцкай духоўнай семінарыі.

Па словах відавочцы, французы на вогнішчах з кніг варылі ежу. Частку кніг удалося схаваць у адным з падвалаў царквы Слуцкага Троіцкага манастыра, але многія сапсаваліся ад вільгаці. Захаваліся кнігі, што былі ў выкладчыкаў і семінарыстаў. Іх сабраў студэнт Ф. Смоліч і тайна вывез у Дзяцелавіцкі манастыр да свайго брата – святара І. Смоліча.

А яшчэ да вайны манастыр на працягу некалькіх гадоў забяспечваў харчаваннем, а іншы раз і грашамі калектыў Слуцкай духоўнай семінарыі (бо быў прыпісаны да Слуцкага Святатроіцкага манастыра). Незадоўга да пачатку вайны выкладчыкі і студэнты семінарыі звярнуліся ў Мінскую епархію з просьбай аб павелічэнні ім утрымання. У пачатку сакавіка 1812 г. віцэ-рэктар семінарыі протаіерэй Іван Лойка звярнуўся да новага кіраўніка епархіі епіскапа Серафіма з той жа просьбай: «...Па курсе на асігнацыі, які ўпаў, выкладчыкі семінарыі да таго даведзены, што не толькі харчавацца, але і стала ні за што наняць не могуць, а ў вучняў, што на казённым кошце, становішча вельмі сумнае, бо не толькі прыстойнага адзення, але і ежу самую бедную маюць».

Далей гаварылася, што штатнай сумы ў 6 тысяч рублёў на ўтрыманне студэнтаў, якія вернуцца «по вакациях» да новага навучальнага года, не хопіць. Пры разглядзе гэтай заявы ў епархіі спаслаліся на завяшчанне заснавальніка манастыра К. Долмата, у якім ён пастанавіў, «чтобы из доходов оного монастыря всегда содержимо было по 12 монашествующих, по 12 вдов и 12 сирот, коих последних и обучать». У манастыры ж у гэты час былі ўсяго два іераманахі і адзін белы (г. зн. звычайны) святар «для истребления по приходу треб», манахаў жа не было, таму прыбыткі манастыра і грошы, якія засталіся ад утрымання, маглі быць аддадзены семінарыі. На падставе завяшчання і распараджэння епіскапа Серафіма было прапанавана «благочестивому Дятеловицкому монастырю» адпусціць семінарыстам пад распіскі рознага роду харчовых прыпасаў, якія семінарыя атрымлівала на працягу года.

Вынікі Айчыннай вайны 1812 г.: спаленыя гарады і вёскі, разбураная гаспадарка, неўраджайны год – усё гэта паўплывала на жыццё Слуцкай семінарыі і Дзяцелавіцкага манастыра. Не было чым плаціць выкладчыкам, не было за што аднавіць разбураныя будынкі. Вырашылі «взять взаймы потребное количество средств из наличных денег Дятловицкого монастыря и удовлетворить всех в счёт жалованья, а по получении возвратить монастырю». Але ў сакавіку 1813 г. рэктар семінарыі дакладваў Свяцейшаму Сіноду, што грошай на капітальную перабудову семінарыі, на жалаванне выкладчыкам няма, таму што «в Дятеловицком монастыре не оказалось свободной суммы». Раздача ў вялікай колькасці прадуктовых і грашовых сродкаў з манастыра вяла да яго паступовага збяднення. Прадуктаў і грошай станавілася ўсё менш. Намеснік Дзяцелавіцкага манастыра ігумен Іасафат даносіў у Мінскую епархію архімандрыту Ісаіі, што манастыр можа адпусціць для выкладчыкаў семінарыі не ўсе прадукты, што выдзяляліся раней, па прычыне эпідэміі і паморку жывёлы і птушкі. Нягледзячы на тое, што манастыр павінен быў забяспечваць семінарыю прадуктамі да 1815 г., выдача іх, хаця і ў паменшанай колькасці, працягвалася да 1817 г.

У 1818 г. царскім загадам Мінская духоўная семінарыя (пераехаўшая ў Мінск Слуцкая духоўная семінарыя) была ўведзена ў першы разрад «с правом получения ею от Дятеловицкого монастыря сырых продуктов для учителей и учеников».

У 1823 г. на паўночны ўсход ад вёскі Дзятлавічы, недалёка ад ракі Цна на сродкі манастыра была пабудавана драўляная Спаса-Праабражэнская царква. Будынак адлюстроўваў сінтэз традыцый народнага дойлідства і асобных прыёмаў стыляў барока і класіцызму. Царква мела разны шасціярусны іканастас з пяццюдзесяццю абразамі, рукапіснае Евангелле XVI ст. (не зберагліся), якія сведчылі пра сувязь з Кіева-Пячэрскай лаўрай. Пад храмам размешчалася пахавальня. На паўднёвы захад ад царквы была ўзведзена драўляная двух’ярусная званіца. У 1871 і 1896 гадах храм перабудоўваўся. У 60-я гг. XX ст. ад удару маланкі цэнтральны купал царквы загарэўся і зваліўся ўнутр храма. Царква пасля пажару не аднаўлялася. У наш час на яе месцы пабудавана цагляная царква. Званіца ж была разабрана перад будаўніцтвам новага храма.

Дзяцелавіцкі манастыр паступова бяднеў. Будынкі, царква патрабавалі капітальнага рамонту. Працавалі некалькі служачых, а манахаў зусім не было. У 1826 г. манастыр быў выведзены з-пад архімандрыцкага ўпраўлення, атрымаў самастойнасць, або «был сделан архимандрией». Цяпер усе прыбыткі заставаліся на месцы, але яны ўжо не маглі аднавіць былой велічы Дзяцелавіцкага манастыра. Частка бібліятэкі была перададзена ў Слуцкі Троіцкі манастыр і семінарыю (у верасні 1840 г. Слуцкая духоўная семінарыя пераехала ў Мінск), частка архіву – у Пінскі Богаяўленскі манастыр, частка царкоўнага посуду была пакінута Дзяцелавіцкай царкве. У 1842 г. маёнткі (1121 душа) Дзяцелавіцкага манастыра канфіскаваны ў казну, а ён прыпісаны да Пінскага Богаяўленскага манастыра. Па шэрагу вышэйназваных, а таксама з невядомых прычын у 1855 г. было прынята рашэнне аб закрыцці Дзяцелавіцкага манастыра, які праіснаваў больш за 280 гадоў.

Такім чынам, на працягу ўсёй сваёй гісторыі Новапячэрскі Дзяцелавіцкі Спаса-Праабражэнскі мужчынскі манастыр заставаўся апірышчам праваслаўнай веры, духоўнасці, культурна-асветніцкім цэнтрам, адной з галоўных святынь Палесся.

**На фото:** *храм Преображения Господня в современных Дятловичах*

